# Гісторыя

*В.В. ЦІШЧАНКА*

## ВЕЛІКАКНЯЖАЦКАЯ ЎЛАДА Ў ВКЛ У 30-я гг. XV ст.

Рассматриваются прерогативы власти великих князей литовских Свидригайлы и Жигимонта Кейстутовича в 1430-е гг. Подчеркивается зависимость этих монархов от влиятельных князей и панов. Отмечается ослабление великокняжеской власти, которое было вызвано ухудшением внутреннего и внешнеполитического положения ВКЛ.

The article is dedicated to the prerogatives of the power of the Grand Dukes Svidrygajla and Zhygimont Kejstutovich in 1430s. It emphasizes the dependence of these monarchs on influential princes and the upper nobility. It shows a decrease of Grand Duke's power, which was caused by deterioration of domestic affairs and international relations of the Grand Principality of Lithuania.

Асобны перыяд развіцця велікакняжацкай улады ў Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) у 30-я гг. XV ст. пачаўся абраннем вялікім князем Свідрыгайлы ў канцы 1430 г., а скончыўся забойствам Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440 г. Абодва названыя манархі ўладарылі ў ВКЛ у вельмі неспрыяльных умовах. Таму ім патрабавалася падтрымка з боку буйных князёў і паноў, якія, аднак, скарыстаўшы абставіны, імкнуліся абмежаваць велікакняжацкую ўладу. У гэты час эканамічныя і палітычныя пазіцыі вялікіх князёў істотна пахіснуліся. Тым не менш іх улада ў ВКЛ была яшчэ дастаткова моцнай.

Згодна з Гарадзельскай уніяй пасля смерці Вітаўта ВКЛ павінна было перайсці да польскага караля Ягайлы. На практыцы ж палітычная эліта ВКЛ (паны і князі) у 1430 г. самастойна, без узгаднення з Ягайлам, абрала новага манарха. Ім стаў Свідрыгайла Альгердавіч, праціўнік збліжэння з Польшчай і даўні сапернік Вітаўта. Калі ў 1430 г. на планаваўшуюся каранацыю Вітаўта ў Вільні сабраліся феадалы з усёй краіны, сярод іх было шмат прадстаўнікоў праваслаўнай арыстакратыі з усходніх зямель ВКЛ. Яе сімпатыі на карысць Свідрыгайлы істотна паўплывалі пры выбары наступніка Вітаўта[1]. Як заўважыў сучасны польскі гісторык Я. Нікадэм, Ягайла не зацвердзіў выбару Свідрыгайлы, бо гэта супярэчыла яго інтарэсам. А сам Свідрыгайла, які хацеў панаваць у ВКЛ як спадчынны манарх, не патрабаваў пацвярджэння[2].

Але польскія кіруючыя колы не прызнавалі ўладу Свідрыгайлы і патрабавалі ад яго скласці васальную прысягу. Адчуваючы падтрымку палітычнай эліты ВКЛ, гаспадар рашуча адмовіўся ад гэтага[3]. Ён дзейнічаў разам з буйнейшымі князямі і панамі, сярод якіх у параўнанні з часамі Вітаўта з'явілася група праваслаўных асоб, хоць і не на буйнейшых урадах. Аднак перавага ў акружэнні правіцеля заставалася за ранейшымі паплечнікамі Вітаўта, якія былі "літоўска"-каталіцкага паходжання. У дакументах яны працягвалі выступаць на першых месцах, што сведчыла аб іх падтрымцы манарха. 19 чэрвеня 1431 г. дагавор, заключаны Свідрыгайлам з Прускім і Інфлянцкім Ордэнам, быў зацверджаны пячаткамі і подпісамі трох каталіцкіх біскупаў, а таксама буйнейшых князёў і "літоўскіх" паноў-ураднікаў. За імем вялікага князя ішоў іх пералік[4]. 1 верасня

1431 г. Свідрыгайла пацвердзіў Чартарыйскае перамір'е з Польшчай. У канцы перамірнай граматы пайменна называліся князі Жыгімонт Кейстутавіч, Алелька Уладзіміравіч, Юрый Лінгвенавіч, Іван Уладзіміравіч, Сямён Іванавіч, Іван Сямёнавіч, паны - віленскія кашталян і ваявода Осцік і Гедыгольд, жамойцкі староста Кезгайла, Івашка Манівідавіч, Ходка Юр'евіч, Петраш Мантыгірдавіч, Шэдзібор Валімунтавіч, Андрэй Неміровіч, Мантоўт, Судзівой Валімунтавіч, Андрэй Саковіч, Івашка Давойнавіч і інш. Усяго грамату падпісалі дзевяць князёў, 42 паны, з іх 20 - літоўскага паходжання[5]. 15 мая 1432 г. князі, шляхта і гарады ВКЛ прысягалі і абяцалі прытрымлівацца дагавора, які быў заключаны Свідрыгайлам з Прускім і Інфлянцкім Ордэнам. На дакуменце знаходзіліся подпісы князёў Івана Уладзіміравіча, Андрэя Уладзіміравіча, Івана Сямёнавіча Пуцяты, Васіля Сямёнавіча, Глеба Кнідэравіча, Федкі Нясвіжскага. Затым пералічваліся гарады - Вільня, Трокі, Кіеў, Чарнігаў, Луцк, Смаленск, Віцебск, Полацк, Наваградак, Бярэсце, Коўна і інш. У канцы граматы знаходзіўся спіс з 50 імён паноў[6].

Свідрыгайла вёў рэй дыпламатычных спраў. У жніўні 1431 г. ён накіраваў да Ягайлы паноў Андрушку Неміровіча і Рагозу, якія ад яго імя і ад імя князёў і баяр ВКЛ прасілі спыніць вайну і для перамоў аб міры скпікаць з'езд прадстаўнікоў абедзвюх дзяржаў. У тым жа 1431 г. у Заволжскай Ардзе знаходзіўся наваградскі ваявода Пётр Мантыгірдавіч, які заключыў саюз паміж Свідрыгайлам і ханам Ул-Мухамедам[7]. Манарх асабіста сустракаўся з іншаземнымі ўладарамі. Так, пасля 20 мая 1431 г. каля Вілейкі адбылася сустрэча паміж Свідрыгайлам і вялікім магістрам Руссдорфам. Каля 15 мая 1432 г. на з'ездзе Свідрыгайла зноў сустракаўся з вялікім магістрам. Побач з вялікім князем прысутнічалі шматлікія князі і паны. Прычым яны ў асобным дакуменце абяцалі прытрымлівацца пагаднення. На зваротным шляху са з'езда ў прысутнасці пяці сваіх саветнікаў Свідрыгайла сустракаўся з мазавецкім князем Земавітам[8].

Большасць даследчыкаў справядліва абвінавачвала Свідрыгайлу ў фаварытызме да праваслаўных князёў і паноў. Аднак з самага пачатку яго кіраўніцтва адзначаная тэндэнцыя яўна не праяўлялася. Гаспадар не мог адразу на месца каталікоў-літвінаў прызначыць праваслаўных-русінаў, бо гэта хутка выклікала б адкрытую рэакцыю. Тым не менш паступова "рускія" князі і баяры ўсё больш актыўна дапускаліся да дзяржаўнай улады ў ВКЛ на вышэйшым узроўні. У чэрвені 1431 г. на дагаворы з Ордэнам сведкам быў рускі баярын Ходка Юр'евіч. Да Чартарыйскага пераміра з Польшчай (1 верасня 1431 г.) прыклалі пячаткі ўжо два русіны. На дагаворы ж з Ордэнам ад 15 мая 1432 г. сярод 50 сведкаў русіны складалі ўжо больш за дзесяць асоб, а таксама прысутнічала 13 пячатак "рускіх" гарадоў. Князі і паны-каталікі пачалі губляць практычна манапольную ўладу ў ВКЛ, што пагражала ім стратай выключнага становішча ў краіне. Таму многія з іх для ратавання ўласных пазіцый у ВКЛ схіляліся да паразумення з Польшчай і пры падтрымцы палякаў у ноч з 31 жніўня на 1 верасня 1432 г. ажыццявілі ў Ашмянах замах на Свідрыгайлу. Сярод змоўшчыкаў знаходзіліся Жыгімонт Кейстутавіч, Сямён Гальшанскі, Сямён Лінгвенавіч, Алелька Уладзіміравіч, Пётр Мантыгірдавіч, Ян Гаштольд і іншыя князі і паны. Але Свідрыгайла, папярэджаны віленскім ваяводам Манівідам, уцёк у Полацк. Змоўшчыкі пасадзілі на віленскі стол Жыгімонта Кейстутавіча, якога прызналі Вільня, Трокі, Коўна, Жмудзь і Гародня. А Свідрыгайлу падтрымалі Полацкая, Віцебская, Смаленская землі. Пачалася грамадзянская вайна, якая цягнулася прыкпадна да 1439 г.[9]

Асноўнай апорай у ёй для Свідрыгайлы былі заможныя праваслаўныя роды Беларусі і Украіны, якія захавалі вернасць яму як вялікаму князю, тады як Жыгімонт Кейстутавіч абапіраўся пераважна на каталікоў. Апе каталікі змагаліся і на баку Свідрыгайлы, а праваслаўныя - у лагеры Жыгімонта. Сярод прыхільнікаў Свідрыгайлы былі і заможныя літоўска-каталіцкія роды - тыя, хто выступаў супраць уніі з Польшчай і за саюз з Тэўтонскім ордэнам. У 1433-1435 гг. наваградскае намесніцтва ад Жыгімонта Кейстутавіча трымаў праваслаўны Івашка Гайцэвіч[10]. Гэтая вайна насіла не столькі нацыянальна-рэлігійны характар, колькі сацыяльны. Княска-баярскія партыі змагаліся паміж сабою не за веру, а за дамінаванне ў дзяржаве, пераважна без уліку веравызнання ці этнічнага паходжання і без закранання інтарэсаў шырокіх слаёў насельніцтва. Лагер, пры-

хільны Свідрыгайлу, заўсёды маляваўся як выкпючна арыстакратычны, маг-нацкі, а прыхільнікамі Жыгімонта называліся сярэднія слаі шляхты. Аднак нель-га прыпісваць Жыгімонту Кейстутавічу нейкія дэмакратычныя тэндэнцыі, быц-цам бы ён абапіраўся на людзей нізкага паходжання. Для разглядаемых часу і ўмоў такая практыка была непрымальнай.

Сапраўды, Жыгімонт жорстка ставіўся да рэальных і магчымых праціўнікаў: знявольваў іх, адымаў урады, канфіскоўваў маёмасць, караў смерцю. У канцы 1432 г. былі арыштаваныя рыхтаваўшыя змову браты Валімунтавічы: троцкі ваявода Ян Яўнута, земскі маршалак Румбольд, жмудскі староста Міхайла Кез-гайла і пан Шэдзібор. Прычым двух першых з названых 7 снежня 1432 г. пакаралі смерцю, а Міхайлу пазбавілі ўрада[11]. Быў зняволены трапіўшы ў снежні 1432 г. у палон князь Юрый Лінгвенавіч. Той жа лёс напаткаў і князя Алельку Уладзіміравіча разам з сям'ёй. Уладанні страцілі Алелька, Юрый Лінгвенавіч, Мітка Давойнавіч, князі Пінскія, Крашынскія, Палубенскія, Сангушкі. Аднак Жыгімонт наўмысна не вынішчаў князёў і паноў. Ён толькі абараняўся супраць магчымай здрады, бо ўжо з першых дзён панавання сутыкнуўся з пагрозай страты не толькі ўлады, але нават і жыцця.

Праз некаторы час былі пакараныя смерцю паслы Свідрыгайлы; пасля - уласныя паслы, якія вярнуліся ад Свідрыгайлы, а таксама ў 1437 г. паслы ад Віцебска і Полацка. Манарх жорстка абыходзіўся з палоннымі лівонцамі, якія трапілі ў палон у бітве пад Вількамірам[12]. Але, як заўважыў Я. Нікадэм, Жыгімонт Кейстутавіч далёка не быў тыранам і толькі часова рэпрэсіраваў Юрыя Лінгвенавіча і Алельку Уладзіміравіча. Не знайшоў дакладнага дакументальнага пацвярджэння той факт, што ў палоне была прыспешана смерць Жыгімонта Карыбутавіча. "Крыважэрны" Жыгімонт Кейстутавіч дзейнічаў вельмі жорстка, але часта апраўдана. Аднак ён нічым не адрозніваўся ад Свідрыгайлы, які пасля доўгага трымання ў няволі загадаў спаліць мітрапаліта Герасіма, а пайманага пад Барысавам князя Міхайлу Гальшанскага - утапіць у Дзвіне ў Віцебску. Але Жыгімонт не ўсіх праціўнікаў пазбаўляў жыцця. З чатырох братоў Валімунтавічаў пакараныя смерцю былі толькі двое, а пяты з іх (Судзівой) нават пазбег арышту. Ацалелыя Валімунтавічы пазбавіліся ўрадаў, але знаходзіліся побач з правіцелем. Гедыгольд страціў віленскае ваяводства, але захаваў уладанні і часта сведчыў на актах манарха. Прыхільнік Свідрыгайлы праваслаўны баярын Ходка Юр'евіч у снежні 1432 г. трапіў у палон да Жыгімонта Кейстутавіча. Заняўшы ж яго бок, хутка стаў праходзіць па дакументах у якасці сведкі. Супраць сквапнасці Жыгімонта сведчаць значныя наданні для Сенькі Гедыголдавіча, Пятра Мантыгірдавіча, Гаштольда, Судымонта. Таму можна сцвярджаць, што постаць Жыгімонта Кейстутавіча была намалявана празмерна згушчанымі фарбамі[13].

У канцы 1432 г. Жыгімонт пазбавіў урадаў віленскага і троцкага ваявод Юрыя Гедыгольда і Яўнута Валімунтавіча, жмудскага старосту Міхайла Кезгайла і зем-скага маршалка Румбольда Валімунтавіча, што дазволіла яму прызначыць сваіх людзей. Такія змены ў палітычнай эліце ВКЛ насілі выключны характар і дыкта-валіся грамадзянскай вайной, саперніцтвам унутры кіруючай групы. А сам ула-дар шукаў найбольш адданых сабе людзей, дастаткова свабодна прызначаючы сваіх прыхільнікаў на пасады і здымаючы з іх. Так, амаль адразу пасля прыходу да ўлады Жыгімонта Кейстутавіча пан Пётр Мантыгірдавіч пазбавіўся наваград-скага намесніцтва. Але ў маі 1434 г. атрымаў урад маршалка земскага, які быў адабраны ў Радзівіла Осцікавіча. Апошні быў на гэтай пасадзе толькі крыху больш за год. Пан Судзімонт ачарніў перад гаспадаром Васіля Зяноўевіча, каб самому заняць яго ўрад крэўскага дзяржаўцы[14].

Ужо 15 кастрычніка 1432 г. Жыгімонт Кейстутавіч афіцыйна стаў вялікім князем. Ён атрымаў уладу ад Ягайлы пажыццёва, без права перадачы яе ў спадчыну[15]. Жыгімонт стаў уладаром ВКЛ, дзякуючы падтрымцы "літоўскіх" князёў і паноў, таму павінен быў дзейнічаць у іх інтарэсах. Аднак ігнараваць праваслаўных феадалаў было ўжо немагчыма. Таму 6 мая 1434 г. Жыгімонт Кейстутавіч як адзіны заканадаўца ад уласнага імя выдаў прывілей, які пачынаўся так: "Жыгімонт.... вялікі князь Літоўскіх і Рускіх зямель, гаспадар і *наследнік...* даём… і дазваляем і даруем… наступнае". У ім "рускім" князям і баярам дазвалялася

свабодна распараджацца спадчыннымі маёнткамі, атрымліваць у спадчыну зямлю жонкамі і дзецьмі. Акрамя гэтага, падданыя ўсіх князёў і баяр вызваляліся ад асобных дзяржаўных падаткаў і павіннасцей[16].

У некалькіх артыкулах афіцыйна ўводзіліся новыя абмежаванні паўнамоцтваў вялікага князя ў ВКЛ. Іншая рэч, наколькі рэальным было іх выкананне. У арт. 1 гаспадар абяцаў караць князёў і баяр толькі паводле адкрытага суда, а не "паводле даноса або тайнага абвінавачвання... ці з благой падазронасці". У арт. 4 Жыгімонтам Кейстутавічам за прыватнымі ўласнікамі пацвярджалася права на ўладанне маёмасцю, якая была пажалавана Вітаўтам і ім самім, чым юрыдычна правіцелю забаранялася самавольна канфіскоўваць нерухомасць у сваіх праціўнікаў. Але распараджацца ёю можна было пры ўмове, "каб прад намі (вялікім князем. - *Ц. В.)* або нашымі ўрадоўцамі рабілі запісы аб іх адчужэнні, абмене, продажу або падарунку". У арт. 5 усе прыватнаўласніцкія падданыя вызваляліся *"ад усякай даніны і чацвяртнёвага падатку, які называецца дзякла,'* якія ад папярэдніх часоў звычайна давалі... нам і нашым папярэднікам". Такім чынам, вярхоўны ўладар пазбаўляўся адной з крыніц сваіх прыбыткаў, што памяншала яго матэрыяльную магутнасць. У канцы граматы называліся прысутныя "кашталян Віленскі Остык, Георгій або Гедыголт з Вішнёва, Бергал Ходкаў з Даўнельтова, Мікалай пісар нашай канцылярыі, нобілі, якія былі на сойме, і іншыя сведкі"[17]. Акрамя ўраўнавання ў маёмасных адносінах праваслаўных з каталікамі, гэты прывілей меў і іншую мэту. Большасць з яго артыкулаў ураўноўвала ў правах баярства ці нетытулаваную шляхту з князямі, якія ўжо карысталіся амаль што ўсімі пералічанымі ў прывілеі правамі. Такім спосабам Жыгімонт імкнуўся аслабіць князёў, якія падтрымлівалі Свідрыгайлу ў грамадзянскай вайне[18].

Захаваўся ліст ад 25 верасня 1433 г. ад Жыгімонта Кейстутавіча да Ягайлы, у якім адлюстраваліся тыя сілы, ад якіх залежаў і на якія абапіраўся вялікі князь. Жыгімонт паведамляў, што да яго з'ехаліся князі, паны, баяры і "ўся зямля", якія выказалі незадавальненне тым, што Ягайла ўключыў у Ясенецкае перамір'е з Ордэнам Свідрыгайлу і нават самастойна накіраваў да апошняга ўласнага пасла. Прысутныя на з'ездзе заявілі наступнае: калі б Жыгімонт нават часова прымірыўся са Свідрыгайлам, то яны не дазваляюць рабіць гэтага. 6 верасня 1434 г. ордэнскі дыпламат паведаміў, што паны катэгарычна адмовіліся выдзеліць нейкія ўладанні для Свідрыгайлы ў ВКЛ. І пазней баяры Жігімонта Кейстутавіча казалі: "Мы хутчэй усе загінем, чым да згоды са Свідрыгайлам дапусцім". У 1437 г. Жыгімонт Кейстутавіч зноў беспаспяхова раіўся з баярамі наконт міру са Свідрыгайлам. Калі планаваўся саюз з каралём Альбрэхтам, то Жыгімонт 19 снежня 1438 г. скардзіўся паслам вялікага магістра, што апошні не паведаміў яму аб выпраўленні Альбрэхтам паслоў у ВКЛ, у выніку чаго ён не заклікаў да сябе сваёй Рады. Напэўна, самастойна ў азначанай справе манарх не мог прыняць рашэнне. Нават калі гэта была адгаворка, то атрымліваецца, што ў падобных справах правіцель абмяжоўваўся сваімі дарадцамі[19].

У 30-я гг. XV ст. у ВКЛ да ўрадавай групы далучыліся новыя асобы, а некаторыя з ранейшых уплывовых чыннікаў ці сышлі з палітычнай арэны, ці загінулі. Адначасова змяняўся характар нарад на двары манарха. Пры Вітаўце яны паступова ператвараліся ў сталы элемент у форме прысутнасці пераважна пажыццёвых ураднікаў, а ў 30-я гг. XV ст. - уяўлялі рэгулярна збіраючыйся пры вялікім князі асяродак. Аднак, хоць у актах Жыгімонта Кейстутавіча ў якасці сведкаў стала выступалі адныя і тыя ж асобы, яны не ахопліваліся формулай "а при том были сведоки наша верная рада князи и панове", якую звычайна выкарыстоўваў тады Свідрыгайла[20].

Вялікі князь раздаваў нерухомую маёмасць, пацвярджаў здзелкі, звязаныя з зямлёй, і ўвогуле кантраляваў яе пераразмеркаванне. У цэлым правіцель кіраваў усім гаспадарчым жыццём краіны. Бягучыя справы манарх мог вырашаць па . ўласнай волі. Аднак пры ўзнікненні больш значных спраў, асабліва калі закраналіся буйныя ўладанні ці аўтарытэтныя і заможныя асобы, ён павінен быў улічваць пазіцыю князёў і паноў, якія складалі яго Раду. У 1434 г. манарх у прысутнасці паноў пацвердзіў віленскаму кашталяну Осціку складзены апошнім вя-

ноўны запіс сваёй жонцы Ганне. 7 лютага 1435 г. сын вялікага князя Міхайла пасля абмеркавання ў Радзе, са згоды асобна вялікага князя і буйнейшых рад-ных паноў (ад імя ўсіх баяр), якія пералічваліся пайменна, выдаў сваёй жонцы Яўфіміі вяноўны запіс на Камянец, Слонім і Ваўкавыск з акругамі ў суме 40 тыс. венгерскіх флорынаў. 15 лютага 1436 г. у прысутнасці Даўгірда, Лялюша, Пятра Мантыгірдавіча, Андрэя Неміровіча, Андрэя Саковіча, Алехны Давойнавіча і сак-ратара Мікалая манарх надаў віленскаму каталіцкаму кафедральнаму касцёлу ся-ло Святгліча з данінай мядовай і даннікамі яшчэ ў двух сёлах, возера Нарач, ловы паміж ракой Нарач і воласцю Кіранец, а таксама язы і перавоз на гэтай жа рацэ[21].

У дыпламатычных справах правіцель дзейнічаў у згодзе са сваімі дарадцамі. У 1432 у ВКЛ да Жыгімонта прыбылі паслы ад Ягайлы, якіх вялікі князь асабіста сустракаў у Гародні з прэлатамі і баярамі. У 1434 г. Ягайлу ў Крынках Жыгімонт Кейстутавіч сустрэў разам з прэлатамі, князямі і панамі. Манарх ад свайго імя заключаў уніі з Польшчай, але ў дагаворах пайменна пералічваліся шматлікія аўтарытэтныя сведкі. У Гарадзенскай уніі ад 15 кастрычніка 1432 г. названыя 22 асобы, сярод якіх на першых месцах выступалі біскупы, князі і буйнейшыя ўрад-нікі. У канцы пайменнага пераліку было занатавана: і іншыя "Prelati, Duces, Boyari et Nobiles terrarum Lythwanie et Russie". 20 студзеня 1433 г. вялікі князь выдаў новы акт уніі з Польшчай. Грамата заканчвалася пералікам 40 прысутных асоб. Акрамя іх адзначалася, што сваю згоду далі многія прысутнічаючыя прэлаты, князі і баяры. Чарговы раз унія з Польшчай пацвярджалася 27 лютага 1434 г. Пайменна адзначана 40 асоб, пераважна паноў-ураднікаў. У грамаце няма под-пісаў ніводнага з князёў. Яшчэ адно пацвярджэнне адбылося 6 снежня 1437 г. паводле нарады з "саветнікамі". Сведкамі гэтага акта былі віленскія біскуп Ма-цей, кашталян Крыстын Осцік, ваявода Даўгірд і Кезгайла Валімунтавіч. Апошні раз Жыгімонт Кейстутавіч гіанаўляў унію 31 кастрычніка 1439 г.[22] Зразумела, што па меншай меры пайменна названыя буйнейшыя князі I паны пры падпі-санні пералічаных актаў павінны былі істотна ўплываць на вялікага князя.

Гаспадар высылаў сваіх прадстаўнікоў для перамоў з іншаземнымі ўлада-рамі. 31 снежня 1435 г. пасля працяглых перамоў быў заключаны вечны мір паміж Польшчай і ВКЛ, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам - з другога. Ад імя Жыгімонта дагавор падпісалі спецыяльна прыбыўшыя для гэтага віленскі і луцкі біскупы, князі Міхайла Жыгімонтавіч, Андрэй Уладзіміравіч, Глеб Даўгоўтавіч, Юрый Сямёнавіч Гальшанскі і паны - віленскія кашталян і ваявода Осцік і Даўгірд, троцкі ваявода Лялюш[23].

У 1440 г., як адзначаў летапісец, "убиень бысть князь велики Жикгимонтъ... во граде Троцех". Забойцы не бачылі ў манарху тырана. Сапраўднай прычынай змовы было непрыняцце прапольскай палітыкі гаспадара, выкліканай хваляван-нем аб будучым лёсе сына. Пасля бітвы пад Вількамірам 30 жніўня - 1 верасня 1435 г. і да смерці манарх спрабаваў умацаваць велікакняжацкую ўладу і забяс-печыць спадчынныя правы на ВКЛ Міхайлу Жыгімонтавічу, стварыць для яго моцную пазіцыю ў будучым. Пад 1440 г. Я. Длугаш пісаў, што пры жыцці Жыгімонта I пад яго ціскам усе "літоўскія" паны склалі Міхайле прысягу вернасці. Выканаўцамі замаху на манарха павінны былі быць князь Іван (ці князі Іван і Апяксандр) Чартарыскі, Даўгірд і Лялюш. Пасля забойства Жыгімонта новым правіцелем ВКЛ наўрад ці стаў бы Свідрыгайла, бо гэта азначала вяртанне аўтакратычнага спосабу кіраўніцтва, пры якім не было месца для магнатаў з уласнай актыўнай палітыкай[24].

30-я гг. XV ст. былі складаным часам для велікакняжацкай улады ў ВКЛ. Са-мастойнае абранне вялікага князя Свідрыгайлы Альгердавіча магнатамі ВКЛ хутка прывяло да вайны з Польшчай. Свідрыгайла не здолеў стабілізаваць сваё становішча. Прыцягненне ім да ўлады ў дзяржаве праваслаўнага насельніцтва выклікала незадавальненне князёў і паноў-каталікоў, а потым змову і абвяшчэн-не вялікім князем Жыгімонта Кейстутавіча. Пачалася грамадзянская вайна, якая ў эканамічных і палітычных адносінах значна аслабіла велікакняжацкую ўладу і ўзмацніла залежнасць правіцеля ад сваіх падданых. Жыгімонт Кейстутавіч быў вымушаны ўзгадняць сваю пазіцыю галоўным чынам з прыхільнымі да яго буй-нымі князямі і панамі. У 1434 г. вялікі князь выдаў агульназемскі прывілей, па-

водле якога ён афіцыйна абмяжоўваўся ў некалькіх накірунках (судаводства, размеркаванне нерухомай маёмасці, натуральныя паступленні). Аднак Жыгімонт Кейстутавіч па-ранейшаму заставаўся галоўным носьбітам выканаўча-распарадчай улады, раздаваў рухомую і нерухомую маёмасці, пацвярджаў ужо існуючыя ўладанні, прызначаў на ўрады і здымаў з іх, вяршыў суд, выдаваў законы, быў галоўнакамандуючым. Пры гэтым вялікі князь павінен быў дзейнічаць узгоднена з буйнейшымі панамі і князямі, якія з'яўляліся яго дарадцамі.

[1] Гл..: Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa1 1846. S. 177; Любы А. Ул. Абранне вялікага князя літоўскага пасля смерці Вітаўта: знешні'і ўнутраны фактары // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. 2004. № 1. С. 10-11.

[2] Гл.: Nikodem J. Stosunki Swidrygielty z Zakonem Krzyzackim w latach 1430-1432 // Biatoruskie Zeszyty Historyczne. 2000. № 14. S. 17.

[3] Гл.: Войтович Л. В. Удільні князівства Рюрйковйчів і Гедйміновйчів у XII-XVI ст. Історико-генеалогічне дослідження. Львів, 1996. С. 143.

[4] Гл.: Малиновский И. А. Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. Томск, 1904. Ч. 2. Вып. 1. С. 71, 126-127; Danitowicz I. Srarbiec dyplomatoW. Wilno1 1862. T. 2. Na 1545. S. 118, 119.

[5] Гл.: Бучінскйй Б. Кілька прйчінков до часів великого князя Світрйгайла // Записки Наукового Товариства ім. Шевченка. 1907. Т. 76. С. 135; Войтович Л. В. Удільні князівства Рюрйковйчів і Гедйміновйчів у XII-XVI ст. Історико-генеалогічне дослідження. С. 144.

[6] Danitowicz I. Op. cit. № 1603. S. 133; Русско-Ливонские акты собранные К.Е. Напьерским. Изданы Археографическою Коммиссиею. Спб., 1868. S. 189-192.

[7] Lewicki A. Powstanie Swidrygietty. Ust?p z dziejow unii Litwy z Koron^. Krakow, 1892. S. 99; Kuczyriski St. M. Ziemie Czernihowsko-siewierskie pod rz^dami Litwy. Warszawa, 1936. S. 226.

[8] Lewicki A. Ibid. S. 88, 141, 142; Danitowicz I. Op. cit. № 1613. S. 136.

[9] Меховский М. Трактат о двух Сарматиях. Л., 1936. С. 104; Danitowicz I. Ibid. Na 1620-1621. S. 137-138; Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi. T. 2. S. 185; Лойка П. А. Палітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім у XIV - першай палове XV ст.: вытокі і вынікі // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 78-79; Полное Собрание Русских Летописей. М., 1975. Т. 35. С. 57.

[10] Сагановіч Г. Нарысгісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн., 2001. С. 97-98; Korczak L. Litewska rada wielkoksi^z^ca w XV wieku. Krakow, 1998. S. 84.

[11] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego ksi^stwa Litewskiego za Jagieltonow. Warszawa, 1930. T. 1. S. 223-224: Lewicki A. Op. cit. S. 159; Korczak L. Ibid. S. 85, 86, 96.

[12] Nikodem J. Pryczyny zamordowania Zygmunta Kiejstutowicza // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. 2002. № 17. S. 16.

[13] Korczak L. Op. cit. S. 80-81; Nikodem J. Pryczyny zamordowania Zygmunta Kiejstutowicza // Ibid. S. 16-19.

[14] Korczak L. Ibid. S. 91-92, 95, 47.

[15] Lewicki A. Op. cit. S. 154; Kolankowski L. Op. cit. T. 1. S. 189; Барвінський Б. Жигимонт Кейстутович Великий князь Литовско-русский (1432-1440). Історйчна монографія. Жовква, 1905. С. 149-150.

[16] Гісторыя Беларусі ў дакументах I матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 216; Лойка П. А. Указ. тв. С. 82.

[17] Там жа. С. 216,217.

[18] Войтович Л. В. Указ. тв. С. 201.

[19] Бучінскйй Б. Указ. тв. С. 140; LewIcki A. Op. cit. S. 240; Барвіньскйй Б. Указ. тв. С. 102-103.

[20] Suchocki J. Formowanie si§ i sktad narodu politycznego w Wielkim Ksi^stwie Litewskim poznego sredniowiecza // Zapiski Historyczne. Rok 1983. T. 48. Z. 1-2. S. 56; Korczak L. Op. cit. S. 20.

[21] Danitowicz I. Op. cit. Ne 1735. S. 168; Monumenta medii aevi historica res gestas Poloniae illustrantia. Krakow, 1891. T. 12. Na 232. S. 342-343; Na 233. S. 343-344; Барвіньскйй Б. Указ. тв. С. 86-87; Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezyi wileriskiej. Krakow, 1948. Na 146. S. 162-165.

[22] Малиновский И. А. Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. Ч. 2. Вып. 1. С. 63-64, 99; Барвіньский Б. Там жа. С. 151, 155, 158, 161.

[23] Барвіньскйй Б. Там жа. С. 66.

[24] Гл.: Полное Собрание Русских Летописей. Т. 35. С. 60; Барвіньский Б. Там жа. С. 92, 99; Nikodem J. Pryczyny zamordowania Zygmunta Kiejstutowicza // Op. cit. 2002. Na 17. S. 28-29.

Паступіў у рэдакцыю 21.03.05.

***Віктар Васільевіч Цішчанка*** - аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў П.А. Лойка.